Последние двадцать лет ансамблем руководит народный артист Беларуси, профессор Валентин Дудкевич. Фольклорное искусство для него – это способ сохранения исторических традиций, связующих поколения.

Танец – это уникальное явление человеческой культуры. Он существовал, существует и будет существовать у всех народов мира, во все времена. Человек танцевал всегда: когда он шел на охоту, когда вступал в брак, когда обучал подрастающее поколения. Танцами люди отмечали самые значимые события в их жизни. В разные эпохи он являлся частью культуры, религии, воспитания, становился профессией, терапией, развлечением, спортом, искусством.

Танец в Беларуси прошел большой путь от начальных этапов зарождения, до наших дней, сохраняя старые традиции народности и приобретая новые оттенки современности.

---

1. Беляева, О.П. Искусство балетмейстера /О.П. Беляева. – 2-изд. – Мінск : РИВШ. – 2014. – 175 с.

2. Чурко, Ю.М. Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. – Минск : Высшая школа. – 1990. – С. 142-198.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Грыбко А.У.,** студэнтка 419к гр.
Навуковы кіраўнік – Зяневіч У.К.

## ТЫПАЛОГІЯ АБРАДАВЫХ ВЯСЕЛЬНЫХ НАПЕВАЎ БЕЛАРУСКАГА ПААЗЕР'Я

Беларускае Паазер'е − адметны ў геаграфічных і этнаграфічных адносінах куток Беларусі. Цэнтрам паўночна беларускай культуры

выступаюць этнаграфічныя раёны Віцебшчыны, але межы яго песеннага стылю выходзяць на паўночныя раёны Міншчыны.

Багацейшы матэрыял для даследвання знакавасці і сутнасці абрадавага фальклора дае вясковае вяселле Паазер‘я. Традыцыйнае вясковае вяселле аб‘ядноўвае кампаненты матэрыяльнай культуры, абрадавыя дзеянні, абрадавы фальклор.

Даследваннем беларускага вяселля займаліся П. Шэйн, Е.Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, дзякуючы ім можна даведацца аб абраднасці вяселля 19 ст., значны ўклад у даследванне зрабіў М.М. Нікольскі, якім былі апісаны старыя вясельны звычаі беларусаў. Т. Б. Варфаламеева даследвала драматургію беларускага вясельнага рытуалу ў аспекце яго музычнай рэгіянальнай спецыфікі. З.Я. Мажэйка ў сваіх працах вызначае тыпалогію вясельных песень.

Вясельны рытуал беларускага Паазер‘я складаецца з трох груп абрадаў: дашлюбных, шлюбных і пасляшлюбных, з якіх найбольш складанай і разнастайнай з‘яўляецца другая. Яна ўключае тры перыяды – пачатковы (ад апранання жаніха да вянчання), цэнтральны (да пасцельнага абрада ўключна) і заключны (пасля пасцельнага абрада да завяршэння вяселля) [2, с.11-12].

Вясельная абраднасць па ўсёй тэрыторыі Беларусі ў аснове сваёй аднародная, галоўныя вясельныя абрады з некаторымі адхіленнямі ў розных мясцовасцях супадаюць. У выніку аналіза апісанняў паўночнабеларускага вяселля можна ўбачыць разнастайнасць мясцовых варыянтаў вясельнай гульні (нават у адной вёсцы), і супадзенне устойліва паўтаральных асноўных абрадаў – «абрадавага мінімума», без якога вяселле ў народнай свядомасці не мае сілы закону. У паўночна беларускай традыцыі, такімі абавязковымі састаўнымі кожнага канкрэтнага рытуала з‘яўляюцца: сватаўство, заручыны, апрананне маладых, благаслаўленне і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адорванне жаніха і нявесты, застолле ў доме нявесты, развітанне яе з бацькоўскім домам, пераезд нявесты ў дом жаніха, застолле ў доме жаніха, пасцельны абрад, праведванне маладой жонкі яе бацькамі праз некаторы час пасля вяселля [1, с. 27].

Вясельныя абрады змяшчаюць у сабе песні, якія больш ясна раскрываюць іх абрадавую сутнасць. Напевы гэтых песень тыпізаваныя, гэта значыць што яны аб‘яднаныя ў групы паводле іх меладычнага і рытмічнага зместу. Кожны структурна-рытмічны тып вясельных напеваў мае дакладныя межы распаўсюджання і пэўны дыяпазон інтанацыйнага напаўнення. Агульнараспаўсюджаныя структурна-рытмічныя прыкметы вясельных напеваў у розных зонах могуць мець розныя інтанацыйныя комплексы і набываць розны характар гучання.

Стабільныя структурна-рытмічныя прыкметы вясельных напеваў даюць магчымасць вылучыць шэсць асноўных тыпаў, якія сустракаюцца на тэрыторыі ўсяго Паазер‘я і выходзяць за яго межы. [3, с.23-24]

Тып I - найбольш жанрава вызначальны сярод усіх тыпалагічных груп вясельных напеваў. Яго стабільныя прыкметы: форма верша $AA_1$, меластрафа AB, складовая структура верша 5+3, асноўная рытмаформула ♪ ♪ ♪ ♪ ♩ | ♪ ♪ ♩ Як правіла, гэта мажорныя пентахордавыя або гексахордавыя з апорай на квінту напевы з частай «ігрой» квітавага і секставага гукаў, з яркімі квінтавымі воклічамі ў канцы першай меладычнай фразы. [3, с. 24].

На напевы тыпу I выконваюцца паэтычныя тэксты, у якіх адлюстроўваюцца розныя моманты рытуальных падзей. У цэлым напевы гэтага тыпу, самыя дынамічныя і рытуальна «вясёлыя». [3, с. 24].

Тып II пры значнай мабільнасці інтанацыйна-меладычнага і структурна-рытмічнага комплексаў валодае таксама стабільнымі прыкметамі: форма верша $AA_1$, меластрафа $AA_1$ ці AB; складовая структура верша 6+4, рытмаформула напеву ♪ ♪ ♩ ♪ ♪ ♩| ♪ ♪ ♪ ♪ Напевы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтага тыпу ў асноўным пентахордавыя і тэтрахордавыя мажорнага або мінорнага нахілення (ва ўсходніх раёнах для іх характэрна «незамкнёная» кальцавая форма меладычнай страфы). Змест песень тыпу II бывае розным: узоры святочных напеваў могуць быць пераінтанаваны ў «абідлівыя» (асабліва ў заходніх і цэнтральных раёнах) [3, с. 25].

Тып III уключае пераважна мажорныя тэтрахордавыя напевы прыпевачнага характару, дзе першы радок верша выконвае функцыю запеву, з рытмаформулай шэсця ў аснове (пры шасціскладовых радках верша). Паэтычны змест тэкстаў адлюстроўвае жартоўны бок рытуалу. Часцей за ўсё напевы гэтыя прысвечаны свату. Напевы тыпу III надзвычай дынамічныя. Асобае месца сярод напеваў, прымыкаючых па структурна-рытмічных адзінках да тыпу III, займае лакальная група заходніх раёнаў. Урачыстасць шэсця спалучаецца ў ёй з напружанай інтанацыяй плачу [3, с. 25-26].

Тып IV аб‘ядноўвае мажорныя пентахордавыя або тэтрахордавыя ў квінце напевы з ярка акрэсленымі рытуальнымі квінтавымі і квартавымі воклічамі. Сяміскладовай структуры верша ў напеве адпавядае «заклінальная» рытмаформула ♪ ♪ ♩ | ♪ ♪ ♪ ♪, упартасць паўтору якой падрэсліваецца злітнасцю абедзвюх фраз меластрафы. У цэнтры паэтычнага комплексу гэтых песень – заклінанне «свадзёбнага песеннага зачыну».

Сярод дынамічных рытуальна «вясёлых» напеваў мясцовага распаўсюджання значэнне набываюць лакальныя групы з дзесяцiскладовымі вершавымі структурамі (з цэзурай пасярэдзіне), рытмізаванымі ў розных раёнах па-рознаму: рытмаформула напеваў паўночна-ўсходніх раёнаў «калядкавая»: ♪ ♪ ♪ ♪ ♩|♪ ♪ ♪ ♪ ♩; паўночна-заходніх – сінкапіравана-танцавальная: ♪ ♩ ♪ ♩♩|♪ ♩ ♪ ♩♩; паўднёва-заходніх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пластычна-»карагодная»: ♪ ♪ ♪ ♩ ♪ | ♪ ♪ ♪ ♩ ♪ або ♪ ♪ ♩ ♪ ♪ | ♪ ♪ ♩ ♪ ♪ [3, с.25-26]

Тып V – самы ёмісты па зместу, разнастайны па характару і мабільны па музычных кампанентах. Ва ўсходняй зоне Паазер‘я уключае дынамічныя, галоўным чынам пентахордавыя, напевы пругкага маторнага характару, абазначаецца тып VА. Стабільная структурна-рытмічныя прыкметы гэтых напеваў: форма вершаванай страфы АА (радзей АБ), меластрафа $AA_1$, складовая структура верша 4+4+3, рытмаформула ♪ ♪ ♪ ♪ | ♪ ♪ ♪ ♪ | ♪ ♪ ♩

У цэнтральнай і заходняй зонах тэтрахордавыя вясельныя напевы пятага тыпу (VБ) набываюць больш песенны або сказавы характар і адрозніваюцца большай меладычнай і рытмічнай гібкасцю. Сярод рытмічных разнавіднасцей гэтых напеваў найбольш тыповыя дзве: $VБ_1$ са складовай структурай верша 4+4+3 і рытмічным зацягваннем у чатырохскладовых групах другога і чацвёртага складоў і тып $VБ_2$ са складовай структурай верша 5+5+3 і зацягваннем чацвёртага складу ў пяціскладовых групах. Сярод разнастайных паэтычных вясельных тэкстаў значнае месца займаюць сюжэты сіроцкія і «сборнай суботы», «наказы» маладой, сватам і г.д. [3, с. 26]

Тып VI найбольш лірычны. Яго прыкметы: трохфазавая меластрафа, шасціскладовая структура асноўнага верша з шасціскладовым «адсячэннем» (5+5)+6, з зацягваннем апошняга складу ў пяціскладовых групах, пятага і апошняга (часта другога і чацвёртага) – у шасціскладовых. Часта форма страфы і рытмізацыя бываюць іншымі. Як правіла, гэта тэтрахордавыя і пентахордавыя напевы, у якіх сказавая інтанацыя спалучаецца з гнуткасцю распеву. Паэтычны змест тэкстаў звязаны з вобразам нявесты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З лакальных груп лірычных вясельных напеваў вылучаюцца тыпавыя напевы паўночных раёнаў Паазер‘я. Для іх характэрна трохфазавая меластрафа, пентахордавыя ладавыя структуры, трынаццаціскладовая структура асноўнага верша з шасціскладовым «адсячэннем» (4+4)+5, з адцягваннем апошняга складу ў першым чатырохскладовіку. Паэтычны змест песень гэтай групы прысвечаны найчасцей маладому [3, с. 26-27]

У шматфарбным чаргаванні песнь, што гучаць на працягу вяселля, у паслядоўнасці іх мелодый, выяўляюцца рысы адзінага напеву-стрыжня, які кожны раз рытмічна пераўтвораецца. Усе гэтыя блізкія аздін да аднаго варыянты мелодый зліваюцца ў мясцовай песеннай традыцыі ў адзін «свадзёбны» гукавы вобраз, утвараючы «голас» вяселля. Паколькі такія працэсы можна бачыць у розных мясцовасцях, то гэта паказвае іх унутраную адзіную, для усіх арэалаў характэрную і ўстойлівую прыроду мелодый.

Такім чынам: як з этнаграфічнага, так і з музычнага боку вясельны рытуал уключае абавязковыя і тыповыя кананічныя напевы, якія носяць агульны характар, групы абрадаў і напеваў лакальнага значэння. У першым выпадку тыповыя напевы могуць ужывацца ва ўсіх, ці ў большасці момантаў вяселля і распаўсюджаны па ўсяму Паазер‘ю. У другім – яны маюць больш вузкі арэал і звязаны з больш канкрэтнымі момантамі вясельнага дзейства.

Усе выдзеленыя тыпы напеваў асвячаюць абшчынную старану паўночнабеларускага вясельнага рытуала: калектыўныя прадстаўленні людзей аб нормах шлюбна-сямейных адносінаў ва ўмовах патрыярхальнай сям‘і. Агульным рытуальным дзействам супрацьпастаўляецца лірыка-драматычная старана, звязаная з вобразам нявесты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Беларуская народная творчасць. Вяселле. Абрад. // В.К. Бандарчык, М.Я. Грынблат і інш., Мн.: Навука і тэхніка, 1978. – 641с.

2. Варфаламееева Т.Б. Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы // Т.Б. Ворфоломеева, Мн.: Наука и техника, 1988. – 156 с.

3. Мажэйка З.Я. Песні беларускага Паазер‘я// М.Я. Грынблат, Р.Р. Шырма, Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – 266 с.

**Грядовкина С.Х.,** студентка 201 гр.

Научный руководитель — Мицкевич Ю.В.

## ПРЕЦЕДЕНТНЫЕ ФЕНОМЕНЫ В РЕКЛАМНОМ ТЕКСТЕ

Реклама в современной науке рассматривается как разновидность массовой коммуникации, как социальный фактор, как элемент национальной культуры. Реклама проникает практически во все сферы жизни современного общества, формирует потребности, привычки, стиль жизни, стереотипы мышления и поведения современного человека.

В последнее время реклама оказалась в центре внимания лингвистических исследований. Реклама представляет собой особый вид текста, который объединяет в себе признаки всех родов словесности и обладает огромной силой психологического воздействия на общество [4]. Тексты этого типа широко внедряются в повседневную языковую (речевую) среду. В рекламном тексте могут быть использованы как вербальный контекст (текстовое выражение), так и невербальный: красочное изображение или схема (в печатной рекламе) либо видеосюжет

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ